# Новыя этапы будаўніцтва

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 26 снежня.

Дзякуючы відэасувязі, у пасяджэнні паўдзельнічалі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Разглядаўся ход будаўніча-мантажных работ у канцэртнай зале "Віцебск" і планы іх заканчэння да XXXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар". Сума, вылучаная на працы сёлета, склала 20 мільёнаў 360 тысяч рублёў. За гэтыя сродкі рэканструяваны лесвіцы, абліцаваны гранітам фасады, добраўпарадкавана прылеглая тэрыторыя, устаноўлены малыя архітэктурныя формы, заменены вітражы, на галоўным фасадзе змантыраваны інфармацыйны святлодыёдны экран. У планах — перабудова памяшканняў і аўтастаянкі, а таксама закупка светлавога, гукавога і ліфтавага абсталявання. Мяркуецца, што Дзяржаўная інвестыцыйная праграма на 2024 год прадугледзіць выдзяленне яшчэ 24 мільёнаў рублёў.

Таксама абмяркоўвалася замена сістэмы дастаўкі кніг "Тэлеліфт" у Нацыянальнай бібліятэцы. Апаратура агульнай вартасцю 6 мільёнаў 700 тысяч рублёў мусіць быць прывезена ў Беларусь да канца красавіка, а ў маі пачнецца мантаж.